8) **Идейно-тематические** – комбинация идейно-характеристических и предметно-тематических (предметно описательных) эмпоронимов: *Коммунарка, Евробум, Адель*;

9) **Образно-тематические** – эмпоронимы указывают на товар (продукцию), но не прямо, а через образ: *Стальная линия, Лакомка, 3 поросёнка, Добрый огонь* [6].

Таким образом, в статье была предпринята попытка расширить и обобщить имеющиеся подходы к классификации названий торговых объектов, предложить свои критерии для типологизации. Приведённая классификация в дальнейшем может быть расширена и дополнена с учётом нового языкового материала.

**Литература**


1 Суперанская, А. В. Общая теория имени собственного / А. В. Суперанская. – Москва : Наука, 1973. – 366 с.

2 Подольская, Н. В. Словарь русской ономастической терминологии. – 2-е изд., перераб и доп. / Н. В. Подольская. – Москва : Наука, 1988. – 192 с.

3 Шмелёва, Т. В. Язык города. Наименования магазинов / Т. В. Шмелёва. – Красноярск : Красноярский университет, 1989. – 40 с.

4 Принципы образования современных эргонимов г. Перми [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://cutt.ly/vbS7U4L. – Дата доступа : 11.05.2021.

5 Тихонов, А. Н. Школьный словообразовательный словарь русского языка: ок. 10000 словообразовательных гнёзд: ок. 40000 слов / А. Н. Тихонов. – Москва : Астрель, 2013. – 605 с.

6 Рогалев, А. Ф. Имя и образ: Художественная функция имён собственных в литературных произведениях и сказках / А. Ф. Рогалев. – Гомель : Барк, 2007. – 224 с.



**УДК 821.161.3-32*Л. Рублеўская**



***К. Г. Навуменка***


## АДМЕТНАСЦІ ЎВАСАБЛЕННЯ МІСТЫЧНАГА ПАЧАТКУ Ў МАЛОЙ ПРОЗЕ Л. РУБЛЕЎСКАЙ


*Артыкул прысвечаны аналізу адметнасцей ўвасаблення містычнага пачатку ў малой прозе Людмілы Рублеўскай на прыкладзе апавядання «Жаніх панны Данусі», што мае жанравы падзагаловак «жахлівае апавяданне». Аўтарам разгледжана літаратуразнаўчае напаўненне паняцця «містыка», вызначаны спосабы ўвасаблення містычнага пачатку ў прозе пісьменніцы, прааналізавана сістэма вобразаў і мастацкіх дэталей, якая дапамагае ёй стварыць адпаведную атмасферу.*


Містыка – адна з самых цікавых літаратурных з’яў. Набыўшы папулярнасць яшчэ ў эпоху рамантызму, яна і сёння інтрыгуе масавага чытача. Па словах І. Гарына, «містыка – гэта патаемная псіхалогія, дысцыпліна аб бясконцых магчымасцях чалавечай свядомасці, спосабах яе “пашырэння”. Яна дорыць самыя вялікія багацці, даступныя чалавеку – унікальныя і ні з чым не параўнальныя перажыванні, раскошу глыбокай павагі і прасвятлення, пачуццё дэміурга, які творыць з пустэчы. Містыка – своеасаблівы “дэманічны” мікраскоп-тэлескоп, які, будучы накіраваны ўнутр свядомасці, паведамляе нам, што менавіта там выяўляецца, што знаходзіцца ўнутры аддаленай зоркі або ўнутры атамнага ядра» [1]. Асноўныя складнікі містычнага твора – гэта дзіўныя падзеі і невытлумачальныя з’явы, прыкметы прысутнасці тагасветнага і вусцішныя істоты, якія ўзнікаюць з ніадкуль. Асноўнае пачуццё тут – выклікаы невядомасцю,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

звышнатуральнымі з’явамі страх, трымценне ад усяго, што не паддаецца лагічнаму тлумачэнню.

Калі звесці рысы містыкі да простага спісу, атрымаем наступнае:

1) у аснову ідэі і сюжэта такога твора пакладзена тэма смерці або тагасветнага;

2) персанажы нярэдка з’яўляюцца альбо ўладальнікамі звышнатуральных (экстрасэнсорных) здольнасцяў, альбо прадстаўнікамі таго свету (прывідамі, дэманамі, хтанічнымі істотамі);

3) мастацкую рэчаіснасць арганізуе прынцып двухсвецця, што прадугледжвае спалучэнне рэальнасці і ірэальнасці, прычым пераважае першая, а патубаковы свет дадае нелагічнай вастрыні звыклым з’вам;

4) нярэдка таямнічыя падзеі і праявы замагільнага свету разлічаны выключна на веру чытача ў звышнатуральнае і ніяк не тлумачацца;

5) атмасфера гісторыі і дэталі антуражу замяшаныя на страху, які нібы выводзіцца з рэальных і лагічных рэчаў – рыпення масніц або выцця ветру за акном.

Галоўны рухавік сюжэта ў містыцы – гэта страх, прычым гэтае пачуццё па логіцы тэксту павінна перадавацца ад героя да чытача. Каб дакладна апісаць такую сцэну, пісьменніку трэба разумець псіхалогію чалавека, а таксама спосабы ўздзеяння на яго страху і вынікі такога ўздзеяння. Таму дасягнуць належнага эфекту з дапамогай толькі вобразнай сістэмы монстраў і зданяў або пейзажу начных могілак не атрымаецца. Без прадчування непазбежнасці жудаснага развіцця падзей, без адчування невядомай небяспекі, ад якой не схавацца і не абараніцца фізічным спосабам, без стварэння атмасферы саспенсу (трывожнага чакання) містыка будзе проста антуражным элементам тэксту, але не тэкстаўтваральнай з’явай.

З другога боку, містыка павінна быць лагічна ўпісана ў сюжэт, то бок жах і страх павінны мець лагічную аснову, праўдападобную крыніцу такога псіхалагічнага стану. Калі герой чаго-небудзь баіцца, то патрэбна кароткая перадгісторыя (напрыклад, чалавек баіцца прывідаў, аўтар павінен пазначыць, адкуль узнік гэты страх і чаму яны яго пужаюць і ў дарослым узросце).

Твор «Жаніх панны Данусі» Л. Рублеўскай сама аўтарка называе «жахлівым апавяданнем», хаця па фармальна-жанравых прыкметах ён хутчэй набліжаецца да містычнай навелы. Гэта невялікі эпічны твор, у якім расказваецца, як правіла, пра нейкі адзін вызначальны, пераломны выпадак з жыцця чалавека. Гэтаму жанру характэрна адна сюжэтная лінія, абмежаваная колькасць дзеючых герояў. Навела характарызуецца напружаным, драматычным дзеяннем, лаканічным паказам не столькі знешніх падзей, колькі перажыванняў і настрою персанажаў, і абавязкова нечаканым фіналам. Навела мае адметны тып кульмінацыі, які прынята называць пуантам. Большасць з пералічаных вышэй рыс прысутнічаюць у творы «Жаніх панны Данусі» Л. Рублеўскай: па аб’ёме тэкст невялікі, тут дзейнічаюць усяго два галоўныя героі: сама панна Дануся і яе жаніх Габрусь, – і два другасныя персанажы: сяброўка панны Данусі Зося і прыбіральшчыца касцёла – удава Юзэфа Шыкулевіч.

Змешчаны ў падзагалоўку тэрмін «жахлівае апавяданне» ўжо накіроўвае чытача на магчымую прысутнасць містыкі ў тэксце, у прыватнасці – на магчымае ўзнікненне пачуцця страху падчас чытання. Пры ўважлівым разглядзе твора становіцца відавочным, што ён напісаны па «містычнаму канону». Тут прысутнічае змрочная атмасфера, карпатліва створаная пісьменніцай як з дапамогай візуальных, так і слыхавых прыёмаў: накрапвае дождж, чутныя рыпучыя гукі канапы, падкрэсліваецца бялюткі твар аднаго з галоўных герояў, звяртаецца ўвага на яго незразумелае мармытанне, нават шэпт бяроз гучыць як перасцярога. Усе гэта трымае чытача ў напружаным стане практычна да апошніх радкоў тэксту.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Навела пачынаецца з апісання галоўнай гераіні панны Данусі, «пекнай выпускніцы Марыінскай жаночай гімназіі горада М*» [2, с. 469], якая нічым не займаецца, ёй сумна. Дзеянне разгортваецца вечарам, а дзявятай гадзіне, ідзе дробны дождж. Ужо такі шэры, «пераходны» пейзаж стварае атмасферу незразумелага напружання. Спалучаючыся з эфектам нечаканасці, яна ўзмацняецца ўдвая: нехта грукаецца да гераіні ў акно. Высвятляецца, што гэта жаніх Данусі – Габрусь, але яго выгляд прымушае гераіню здзівіцца: у яго белы, як крэйда, твар, што ўжо павінна скіраваць чытача на пэўныя думкі. Гэта першая прыкмета таго, што ўжо аповед набывае містычны характар.

Далей – цікавей. Дануся здзіўлена прысутнасцю Габруся, бо ён павінен быць у гэты позні час на працы, інспектаваць чыгунку. Аднак такому факту знаходзіцца рацыянальнае вытлумачэнне. Малады чалавек настолькі адданы каханню да сваёй дзяўчыны, што мог прапусціць працу. З іншага боку, ён не здольны схлусіць любай пра сапраўды важныя рэчы. На наш погляд, гэты момант таксама ўзмацняе эфект загадкавасці і туманнасці далейшага развіцця падзей і ўказвае (найперш чытачу) на прысутнасць звышнатуральнага побач з цалкам рэальнымі рэчамі.

Пэўна, самым невытлумачальным у ходзе падзей становіцца тое, што Габрусь адмаўляецца зайсці ў дом і застаецца стаяць, «як слуп» [2, с. 470], перад уваходам. Відавочна, нешта невытлумачальнае не дае закаханаму зайсці ў дом, перашкаджае яму і абараняе Дануту. Нават бярозка, якая стаіць недалёка ад дома, нібы кажа гераіні не ехаць з жаніхом, а крыху пачакаць.

У пачатку апавядання ёсць даволі цікавы эпіграф з балады з вандроўным сюжэтам, найбольш вядомым у эпоху рамантызму ва ўвасабленні Г.-А. Бюргера («Ленора»):

*За месяцам месяц мінае,*
*Вось вершнік у шыбу грукае*
*Увосень парой начною:*
*«Ты помніш ці не, дарагая,*
*Як калісь мяне кахала?*
*Сядай на каня са мною!» –*
*«Мой любы, заўжды з табою!»* [2, с. 468].

І для абазнанага чытача такая рама – ужо прагнастычны знак прысутнасці містычнага ў навеле, хаця ў яе цэнтры зусім іншы, чым у рамантыкаў, часавы прамежак: пачатак ХХ ст. Эпіграф пераклікаецца з «пуантам» твора, калі Габрусь чакае Дануту на вуліцы і нібы нешта шэпча пра вечнае і незямное каханне. Далей разгортваюцца самыя важныя падзеі. Пасля таго, як закаханыя на шыкоўным аўтамабілі Габруся ад'язджаюць ад дома і нават бяруць у кампанію сяброўку Данусі Зосю, жаніх па невядомых прычынах збочвае на шлях да Кальварыйскіх могілак. Але дзяўчаты не заўважаюць падвоху, бо яны ўвесь час «сакаталі і ўвесь час прымушалі апатычнага Габруся націскаць на гумавую грушу гукавога сігналу» [2, с. 471]. Прычым, як і належыць канонам містычнай літаратуры, сяброўкі да апошняга моманту не бачаць небяспекі, яны вырашаюць, што «Габрусік, бедны, у прыбіральню хоча, вось і заехаў сюды» [2, с. 472].

У творы ёсць цікавы эпізод, калі Габрусь просіць дзяўчыну заспяваць пахавальную песню. Здаецца, што Габрусь нібы прывёз дзяўчат на свае хаўтуры. А хвілінай раней над магілкамі «разнеслася вельмі меладычная і павучальная песня з рэпертуару хору Апякунства аматараў цвярозасці горада М*» [2, с. 473].

Развязка ўсіх лагічна невытлумачальных дзеянняў Габруся вырашаецца праз маналог героя. Ён расказвае дзяўчатам, што з ім здарылася насамрэч. Аказваецца, Габрусь быў на працы ў гэты вечар, але здарылася непрадказальнае: «<…> цягнік, на якім ехаў я на інспекцыю чыгуначнай станцыі Н*, ляжыць пад адхонам» [2, с. 473]. Гэта значыць, што Габрусь – нябожчык, а яго цела знаходзіцца на месцы, дзе сышоў цягнік.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Адметна, што дзяўчаты не звяртаюць ніякай увагі на прызнанні Габруся і бягуць да яго машыны. Відавочна, «закаханую» Дануту больш за каханне цікавіць машына Габруся, яго пасада, статус і матэрыяльны стан.

Цікавы і эпізадычны вобраз кабеты, якая працавала ў той вечар у касцёле і «не была прагрэсіўнай жанчынай» [2, с. 473]. Але нават яна заўважыла, што постаць Габруся, якая стаяла каля касцёла – гэта не чалавек, а прывід, і сказала яму: «Vade retro, satanas!» [2, с. 473], што значыць «Ідзі прэч, Сатана!». Гэтага інцыдэнту, безумоўна, Данута не заўважыла, бо была больш занятая аўтамабілем жаніха.

Такім чынам, містычная навела «Жаніх панны Данусі» Л. Рублеўскай грунтуецца на стварэнні пачуцця страху невядомага. Тут яскрава праяўляюцца асноўныя прыкметы жанру, найперш праз паказ змрочнага, шэрага, «пераходнага» пейзажу, адпаведных гукавых эфектаў (шэпту бяроз, мармытання героя, грукату, рыпення, манатоннага дажджу і пад.). Трывожная атмасфера і адметны каларыт ствараюцца і з дапамогай вобразнай сістэмы (могілкі, крумкач, анёл, які пралятае над кладамі, прывід Габруся). Каб чытач быў у напружанні да апошніх радкоў твора, пісьменніца выкарыстоўвае прыёмы нагнятання трывогі, саспенсу, жахлівай нечаканасці.

### Літаратура


1 Гарин, И. И. Что такое мистика? [Электронны рэсурс] / И. И. Гарин. – Рэжым доступу : https://www.elibrary.ru/item.asp?id=19901628. – Дата доступу : 21.04.2021 г.

2 Рублеўская, Л. Ночы на Плябанскіх Млынах / Л. Рублеўская. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2013. – 526 с.



**УДК 821.161.3-31*Л. Рублеўская**



***К. В. Ніцыеўская***


## ФЕНОМЕН СТРАХУ Ў АПОВЕСЦІ «ДЗЕЦІ ГАМУНКУЛУСА» Л. РУБЛЕЎСКАЙ


*«Дзеці Гамункулуса» Л. Рублеўскай – містычны дэтэктыў, у якім выразна выяўлены феномен страху. Мэта дадзенага артыкула – вызначыць яго мадыфікацыі, адметнасці і ўзроўні рэалізацыі ў творы, чаго дагэтуль у сучасным літаратуразнаўстве здзейснена не было. У ходзе даследавання атрыманы наступны вынік: для стварэння неспакойнай, трывожнай атмасферы ў аповесці прысутнічаюць элементы хорару і тэрору, містычнага страху і саспенсу, арганізаваныя праз выкарыстанне прыёму антытэзы, уздзеяння на розныя органы пачуццяў. Ключавыя вобразы-сімвалы аповесці выступаюць метафарамі агульнаграмадскіх страхаў.*


Тэма страху – адна з самых запатрабаваных у прыгожым пісьменстве. Яна належыць да катэгорыі «вечных», бо не страчвае сваёй актуальнасці і ўласціва ўсім культурам без выключэння, да яе звяртаюцца ў літаратуры, у музыцы, у выяўленчым і іншых мастацтвах. Праз страх як літаратурны феномен пісьменнікі ўздзейнічаюць на эмацыйна-пачуццёвы пачатак чытача, уплываюць на асаблівасці яго адносінаў да рэчаіснасці, закранаюць патаемнае, тое, што ў рознай ступені ўласціва ўсім людзям, а таму знаходзіць у іх непасрэдны водгук.

Г. Ф. Лаўкрафт пісаў: «Страх – самае старажытнае і моцнае з чалавечых пачуццяў, а самы старажытны і самы моцны страх – страх невядомага» [1]. Гэтае выказванне добра суадносіцца з сучасным філасофскім асэнсаваннем страху, які прынята разглядаць як



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ